Палепшылі свае ўмовы пераездам у іншае памяшканне Гарадоцкая раённая бібліятэка, Дубраўская бібліятэка-філіял Ушацкай ЦБС, Папшулёўская сельская бібліятэка Міёрскай ЦБС, Чарневіцкая сельская бібліятэка Глыбокскай ЦБС, Пышнянская сельская бібліятэка-клуб Лепельскай ЦБС, Старадворская сельская бібліятэка Пастаўскай ЦБС, Заборская сельская бібліятэка Рассонскай ЦБС.

У студзені 2015 года Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка пераехала ў рэканструяванае памяшканне кінатэатра “Родина”. Згодна рашэння Гарадоцкага райвыканкама ён набыў статус юрыдычнай асобы пад назвай “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”. Зараз у будынку культурна-асветніцкага цэнтра акрамя ЦРБ размясціліся выставачная зала, літаратурна-музычная гасцёўня (кіназала) і міні-кафэ.

На працягу года ў вобласці праведзены бягучы рамонт у 59 бібліятэках.

Разам з тым, у 2015 годзе капітальны рамонт і рэканструкцыя цэнтральных градскіх і раённых бібліятэк Віцебскай вобласці не праводзіліся, аднак капітальнага рамонту патрабуе Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна.

Без ацяплення знаходзіцца Шунеўская сельская бібліятэка (Глыбоцкі р-н) і Хацілаўская сельская бібліятэка (Паўстаўскі р-н).

Тэлефанізавана **390** (76,4 %) бібліятэк, не маюць уласнай сувязі 120 бібліятэк (23,5%).

Кадры

Бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва публічных бібліятэк Віцебскай вобласці забяспечвала **1311** бібліятэкараў, сярод якіх **70,3** % з профільнай адукацыяй.

Найлепшая сітуацыя па наяўнасці спецыялістаў з бібліятэчнай адукацыяй склалася ў Наваполацку (89,8%), Віцебску (75,7%), Чашніцкім (86,8%), Дубровенскім (84,2%), Лепельскім (72,1%), Аршанскім (71,2%) раёнах, недастатковая колькасць бібліятэчных супрацоўнікаў са спецыяльнай адукацыяй выяўлена ў Расонскім (54,2%), Верхнядзвінскім, Віцебскім раёнах (55%).

На працягу года 51 супрацоўнік працягваў навучанне на дзённай і завочнай формах ва ўстановах адукацыі, сярод іх: у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў – 12, Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме – 6, Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава – 21, іншых установах – 7. Праходзілі перападрыхтоўку па профілі ў Інбелкульце 5 чалавек. Акрамя таго супрацоўнікі бібліятэк навучаліся па розных спецыяльнасцях у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыеэлектронікі.

На рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі павысілі прафесійны ўзровень 19 супрацоўнікаў. Віцебскі абласны цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры наведалі 59 чалавек. На жаль, у мінулым годзе на абласным узроўні не было прадстаўнікоў з Полацкага, Ушацкага раёнаў і г. Наваполацка.

ДАДАТКІ

Дадатак 1
Табліца 1

РЭАРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2015 ГОДЗЕ

Рэгіён	Назва ўстановы	Нумары і даты рашэнняў
	АДКРЫТА	
Верхнядзвінскі (+1)	**Вусцянская** бібліятэка (пераўтворана з Вусцянскага клуба-бібліятэкі).	Рашэнне Верхнядзвінскага РВК № 760 ад 17.09.2015.
УСЯГО	**1**	
	ЗАКРЫТА	
Браслаўскі (-10)	**Урбанская** бібліятэка-філіял № 25 закрыта 01.04.2015. **Відзы-Лаўчынская** бібліятэка-філіял № 40 закрыта 01.05.2015. **Зарачская** бібліятэка-філіял № 23 закрыта 01.05.2015. **Барунская** бібліятэка-філіял № 17 закрыта 01.06.2015. **Замошская** бібліятэка-філіял № 6 закрыта 01.06.2015. **Опліская** бібліятэка-філіял № 15 закрыта 01.07.2015. **Карасінская** бібліятэка-філіял № 60 закрыта 01.07.2015. **Падрукшанская** бібліятэка-філіял № 44 закрыта 01.06.2015. **Гірэйшанская** *інтэграваная* бібліятэка-філіял № 53 закрыта 01.10.2015. **Відзаўская *дзіцячая*** (аб’яднана з Відзаўскай гарпасялковай № 2.) закрыта 15.10.2015.	Рашэнне Браслаўскага РВК № 248 ад 27.02.2015. – // – – // – – // – – // – – // – – // – – // – – // – Рашэнне Браслаўскага РВК № 1000 ад 07.08.2015.
Віцебскі (-2)	**Лятчанская, Малалятчанская** бібліятэкі закрыты 01.10.2015.	Рашэнне Віцебскага РВК № 869 ад 17.07.2015.
Гарадоцкі (-1)	**Гарадоцкая *дзіцячая*** бібліятэка рэарганізавана ў аддзел дзіцячай і юнацкай літаратуры 01.01.2015.	Рашэнне Гарадоцкага РВК № 977 ад 28.01.2014.

Сустрэча пісьменнікаў Ліпецка з бібліятэкарамі Віцебска. Прэзентацыя кнігі "Помнит сердце, не забудет...", прысвечанай 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
ДУ "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска"

Вечар памяці земляка, пісьменніка-марыніста, капітана 1-га ранга Васіля Рудога, арганізаваны ў рамках беларуска-расійскай патрыятычнай акцыі "Родина помнит".
ДУК "Верхнядзвінская цэнтралізваная бібліятэчная сістэма"

За 2015 год у калектывы Браслаўскага, Гарадоцкага, Лепельскага, Міёрскага, Аршанскага, Шаркаўшчынскага, Шумілінскага раёнаў, г. Наваполацка і Віцебскай абласной бібліятэкі ўсяго прыбыло 14 маладых спецыялістаў, прафесійна падрыхтаваных і здольных фарміраваць станоўчы імідж бібліятэчных устаноў.

Развіццё прафесійных кампетэнцый

На павышэнне ўзроўню прафесійных кампетэнцый былі накіраваны канферэнцыі, семінары, прафесійныя конкурсы.

Сярод найбольш значных падзей 2015 года варта адзначыць міжнародную канферэнцыю, прысвечаную 170-годдзю з дня нараджэння этнографа, краязнаўцы Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага, арганізатарамі якой выступілі Віцебская абласная бібліятэка, Віцебскі абласны краязнаўчы музей і Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава. Для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена больш за 70 заявак ад краязнаўцаў, гісторыкаў, работнікаў музеяў, бібліятэк, вышэйшых навучальных устаноў з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Азербайджана. З дакладамі перад удзельнікамі канферэнцыі выступілі бібліятэкары Дубровенскага і Шумілінскага раёнаў ("Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк Дубровенскага раёна"; "История Добейского края: поисково- исследовательская деятельность библиотеки").

Варта згадаць таксама ўдзел публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў міжнародным праекце Пскоўскай абласной бібліятэкі па стварэнні сеткавага цытатніка "Поддержи А.П. Чехова!". Вынікі праекта апублікаваны на старонцы Міжнароднага бібліятэчнага цэнтра па адрасе: http://inter.pskovlib.ru/chehov.

У рамках рэалізацыі Праграмы супрацоўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквы, Праграмы супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой у 2015 годзе заснавана штогадовае правядзенне рэспубліканскага конкурсу *"Бібліятэка – цэнтр духоўна-маральнай асветы і выхавання"*. Сярод бібліятэк сеткі Міністэрства культуры яго першымі лаўрэатамі па выніках 2014 года сталі Крапівенская сельская бібліятэка-філіял ДУК "Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", бібліятэка імя Я. Купалы ДУК "Полацкая ЦБС", а таксама цэнтральная бібліятэка ДУК "ЦБС г. Наваполацка".

Лаўрэатамі штогадовага рэспубліканскага конкурсу *"Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры"* выступілі дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ДУК "ЦБС г. Наваполацка", Обальская гарпасялковая бібліятэка ДУК "Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", а таксама аддзел бібліятэчнага маркетынгу ДУК "Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".

Напярэдадні Дня работнікаў культуры, які адзначаецца ў другую нядзелю кастрычніка, былі названы імёны лаўрэатаў *абласной прэміі*, якая ўручаецца аблвыканкамам, *за высокія творчыя дасягенні ў сферы культуры і*

мастацтва. Лепшым бібліятэчным супрацоўнікам у 2015 годзе прызнана дырэктар ДУК “Віцебская раённая цэнтралізваная бібліятэчная сістэма” **Галіна Дзмітрыеўна Нісневіч**.

На пасяджэнні выніковай калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама адбылося прысуджэнне *прэмій Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва*. У намінацыі “Лепшая раённая (гарадская) бібліятэка” адзначана цэнтральная бібліятэка ДУК “Цэнтральная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна” (дырэктар Ляснеўская Вольга Анатольеўна), у намінацыі “Лепшая дзіцячая бібліятэка” – Докшыцкая раённая дзіцячая бібліятэка ДУК “Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” (загадчык Гудзь Алена Уладзіміраўна) і дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка” (загадчык Цімафеева Екацярына Аляксандраўна).

Літаратурныя прэміі

На працягу года ў вобласці адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы па шанаванні лаўрэатаў літаратурных прэмій імя Петруся Броўкі і Уладзіміра Караткевіча, заснаваных Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам.

20 сакавіка ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага адбылася цырымонія ўручэння літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі за 2014 год. У намінацыі “Проза” адзначаны Барыс Беляжэнка за кнігі “Круги земные” і “Дарога да Бачэйкава”; у намінацыі “Паэзія” – Мікалай Намеснікаў за зборнікі “Листопад исповедальный” і “Время яблок”; у намінацыі “Літаратура для дзяцей” – Святлана Гук (Дзядзінкіна) за кнігі “Бабраня на Бузянцы” і “Юшка Вялеса”.

26 лістапада ў Віцебскай абласной бібліятэцы адбылося літаратурнае свята, прымеркаванае да 85-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, пісьменніка, драматурга, сцэнарыста Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча. Тут жа адбылося ўзнагароджанне пераможцаў літаратурнага конкурсу “Быў. Ёсць. Буду”, а таксама цырымонія ўручэння літаратурнай прэміі імя Уладзіміра караткевіча за 2015 год, лаўрэатамі якой сталі Ігар Пракаповіч за кнігу “Чароўны край – Пастаўшчына” (проза); Галіна Загурская за кнігу “З росаў святаянных” (паэзія); Беларускі тэатр “Лялька” (намінацыя “Прапаганда жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча”).

Міжнародныя стасункі і прафесійнае супрацоўніцтва

Бібліятэкі вобласці падтрымлівалі творчыя стасункі з калегамі блізкага замежжа.

У красавіку на базе Лёзненскай раённай бібліятэкі адбыўся *міжнародны семінар “70-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца...”* з удзелам спецыялістаў Руднянскай ЦБС Смаленскай вобласці.

8 мая 2015 г. Акцыя памяці “Дзень белых журавоў”.
ДУ “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска”



8 мая 2015 г. Бібліятэчная пляцоўка і міні-музей ў бібліёбусе “Вайна ў лёсе маёй сям'і”. Патрыятычная акцыя “Нязгасны агонь памяці”.
ДУК “Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Гарадскі конкурс буктрэйлераў "Книга о войне: новый формат".
ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

Творчая сустрэча з доктарам гістарычных навук, прафесарам Вольгай Ляўко. Прэзентацыя кніжнай серыі "Древнейшие города Беларуси", якая ўключае даследаванні пра гарады, што стаялі ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці: "Витебск" (2010), "Полоцк" (2012), "Друцк" (2014).
ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

Пры садзейнічанні раённых бібліятэк Лёзна і Рудні, самадзейныя паэты Лёзненскага і Руднянскага раёнаў сустракаліся на Міжнародным *паэтычным конкурсе "Руднянские зори"* у г. Рудня Смаленскай вобласці і Міжрэгіянальным *фестывалі аматарскай песні і паэзіі "Песні сунічных бароў"* у г.п. Лёзна.

На працягу года загадчык дзіцячай бібліятэкі Лёзненскай ЦБС В.У. Пячонава прымала ўдзел у *міжнародных дзіцяча-юнацкіх Елізавецінскіх чытаннях*, якія праходзілі ў абласной дзіцячай бібліятэцы горада Смаленска, а таксама ў сустрэчы школьнікаў з праваслаўнымі паэтамі і пісьменнікамі "Новый выбор России", дзе дзялілася вопытам работы бібліятэкі па духоўным выхаванні чытачоў.

Адбыліся візіты дэлегацый Красінскага раёна (Расія) і Дагдскага краю (Латвія) ва ўстановы культуры Дубровенскага раёна. Госці наведалі бібліятэку аграгарадка Ляды, а таксама сельскую бібліятэку – цэнтр экалагічнай асветы аграгарадка Асінторф.

Падзеяй 2015 года ў Оршы стала адкрыццё на пачатку года на базе дзіцячай бібліятэкі імя У. Караткевіча "*Французскага кутка Чытання і Інфармацыі"*. На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь, раённага выканаўчага камітэта, бібліятэкары, настаўнікі і вучні школ горада і раёна. Госці падаравалі дзіцячай бібліятэцы 76 кніг і дыскаў на французскай мове. Навучэнцы школ, якія вывучаюць французскую мову, падрыхтавалі для ўдзельнікаў мерапрыемства канцэртную праграму. Дзейнасць біліятэкі па папулярызацыі фонду на французскай мове значна актывізавалася. Так, у красавіку дзіцячую бібліятэку наведалі члены бельгійскай дабрачыннай арганізацыі "A.S.B.L.", якія расказалі аб сваёй краіне і традыцыях, здзейснілі віртуальнае падарожжа "Удивительная страна Бельгия" і адказалі на шматлікія пытанні чытачоў бібліятэкі. У жніўні дзіцячую бібліятэку імя У. Караткевіча наведалі віцэ-прэзідэнт асацыяцыі "Франция – Россия – страны СНГ" горада Невер (Францыя) Мішэль П'я-Банэ і настаўнік французскай мовы гімназіі № 17 г. Мінска Г.І. Фяцісава. Мішэль П'я-Банэ, якая сама піша казкі для дзяцей, пазнаёміла вучняў, якія вывучаюць французскую мову, з культурай, традыцыямі і архітэктурай Францыі, падаравала бібліятэцы кнігі, ілюстраваныя аўтарскімі фотаздымкамі.

Полацкая РЦБС працягвала супрацоўніцтва з інфармацыйнымі цэнтрамі пасольстваў ЗША. На працягу года ў бібліятэкі сістэмы паступілі новыя кнігі і DVD па мастацтве.

У студзені супрацоўнік бібліятэкі замежнай літаратуры Віцебскай ГЦБС знаходзілася на стажыроўцы ў ЗША, якая праходзіла па праграме развіцця лідарскіх якасцей ("Амерыканскія куткі: партнёры ў галіне публічнай дыпламатыі") і была арганізавана Дэпартаментам ЗША для супрацоўнікаў куткоў амерыканскай літаратуры ў розных краінах свету. У Віцебску, у межах святкавання 70-годдзя заснавання ААН, бібліятэку замежнай літаратуры наведаў Паверанны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Скотт Роланд (Scott Roland). Кіраўнік амерыканскай місіі выступіў перад аўдыторыяй і перадаў у дар бібліятэцы "Творчую лабараторыю" – наборы для тэхнічнай творчасці, канструктары для вывучэння робататэхнікі,

прафесійныя наборы Lego, 3-D ручкі, 3-D прынтар.

У лютым, у цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага Віцебскай ГЦБС адбылася сустрэча аматараў кіно з удзельнікамі Фестывалю амерыканскага дакументальнага кіно (Мінск) рэжысёрам і прадзюсарам Жан-Мішэлем Діссарам і кінакрытыкам Майклам Рыновам. У 2015 годзе з творчым візітам цэнтральную бібліятэку наведалі пісьменнікі Ліпецка (Расія) – горада-пабраціма Віцебска. Гасцямі віцяблян сталі паэты Валянцін Анатольевіч Баюканскі і Аляксандр Віктаравіч Кулік, якія з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў "Воінская садружнасць". Яны падаравалі для бібліятэкі зборнік вершаў "Помнит сердце, не забудет…", выдадзены да 70-годдзя Вялікай Перамогі. У цэнтральнай бібліятэцы таксама быў арганізаваны *паэтычны відэамост Віцебск – Санкт-Пецярбург*, у якім бралі ўдзел паэт, старшыня віцебскага аддзялення Беларускага літаратурнага саюза "Полоцкая ветвь" Алег Сяшко, паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Крыклівец, паэт, бард Уладзімір Цвікі. З боку Санкт-Пецярбурга высупалі кампазітар і спявак Аляксандр Джыгіт, паэтэса, член праўлення Санкт-Пецярбургскага саюза літаратараў Ірына Глебава і іншыя.

Арганізацыя і змест бібліятэчнага абслугоўвання

Нестацыянарнае абслугоўванне. Па выніках 2015 года ў 16 раёнах Віцебскай вобласці дзейнічаў **171** бібліятэчны пункт (-2 да 2014 г.). На тэрыторыі вобласці функцыянавала **18** бібліёбусаў, паслугамі якіх скарысталіся **6,5** тыс. чалавек. Колькасць наведванняў склала больш **30,6** тыс. разоў, кнігавыдача – больш за **136,6** тыс. экз. Колькасць населеных пунктаў, што абслугоўваліся бібліобусамі склала **724** адзінкі. Найбольшая колькасць вёсак, узятых на абслугованне бібліобусам, выяўлена ў Браслаўскім (79), Сенненскім, Шумілінскім (58), Бешанковіцкім (54) раёнах. Агульная колькасць маршрутаў, па якіх выязджалі мабільныя бібліятэкі, склала **203**. Колькасць пунктаў на 1 маршруце вагалася ад 1 да 12. Усяго было зроблена **1352** выезды. Кожны населены пункт быў наведаны ў сярэднім **6,7** разоў. Працэнт ахопу бібліятэчным абслугованнем насельніцтва ў зонах абслугоўвання па вобласці склаў **23,9%**.

Бібліятэкарамі бібліёбусаў былі арганізаваны: гадзіна паэтычнага настрою "Пра маці з любоўю, павагай, пяшчотай" (Бешанковіцкая ЦБС), прэзентацыя кнігі А. Сульянава "Непобедимые" аб гераічных асобах вайны (Браслаўская ЦБС), бібліяагляды "Новыя імёны на літаратурным небасхіле", "Этих дней не смолкнет слава" (Віцебская РЦБС), літаратурны партрэт да 50-годдзя з дня нараджэння Л. Рублеўскай "Рыфма коштам у жыццё" (Дубровенская ЦБС), адкрыты прагляд літаратуры "Духовная книга", паэтычная гадзіна "Войной овеянные строки" (Лёзненская ЦБС) і інш.

Актыўнымі ў арганізацыі работы бібліёбусаў з'яўляюцца супрацоўнікі Віцебскага і Сенненскага раёнаў.



Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 170-годдзю з дня нараджэння беларускага гісторыка, этнографа М. Нікіфароўскага.

ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

9. **Голубенко, Н. Б.** Библиотечное дело: инновации и перспективы : [аналитический обзор] / Н. Б. Голубенко. – М. : Логос, 2014. – 128 с.

10. Грекова, Л. В. Компетентностный подход в дополнительном профессиональном библиотечном образовании : научно-практическое пособие / Л. В. Грекова. - М. : Литера, 2014. – 192 с.

11. **Зиновьева, Н. Б.** Библиотека в системе современных научных коммуникаций : научно-практическое пособие / Н. Б. Зиновьева. – М. : Литера, 2015. – 136 с. – (Современная библиотека).

12. **Кабачек, О. Л.** Волшебный мир библиотеки : что ждут от библиотеки дети, и что она может им предложить / О. Л. Кабачек. – М. : РШБА, 2014. – 200 с. – (В помощь педагогу-библиотекарю; вып. 3).

13. **Кашкаров, А. П.** Адаптация мигрантов: роль библиотеки : методические рекомендации от специалистов-практиков / А. П. Кашкаров. – М. : Либер-Дом, 2014. – 128 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. № 156).

14. Кононенко, И. М. Муниципальные публичные библиотеки: трансформации во времени : научно-практическое пособие / И. М. Кононенко. – М. : Литера, 2014. – 88 с. – (Современная библиотека).

15. **Лоэртшер, Д.** Виртуальное образовательное пространство: создание интерактивного учебного пространства школы : в помощь педагогу-библиотекарю / Дэвид Лоэртшер, Кэрол Коклин, Эстер Розенфельд ; перевод: В. В. Зверевича, Т. О. Зверевич. – М. : РШБА, 2015. – 280 с.

16. **Орлов, В. В.** PR-технологии в управлении имиджем библиотеки : учебно-практическое пособие / В. В. Орлов. – М. : Литера, 2015. – 192 с. – (Современная библиотека).

17. **Сабинина, Т. Б.** Организационная культура библиотеки : учебно-методическое пособие / Т. Б. Сабинина. – СПб. : Профессия, 2014. – 304 с. – (Библиотека).

18. **Серебряная, М. Я.** Типология чтения и читателей художественной литературы : научно-практическое пособие / М. Я. Серебряная, Г. Н. Швецова-Водка. – М. : Литера, 2014. – 304 с. – (Современная библиотека).

19. **Татаринова, Е. А.** Выставки в библиотеке: зачем и как? : практическое пособие / Е. А. Татаринова. – М. : Литера, 2014. – 144 с. – (Современная библиотека).

20. **Чепелева, Л. Е.** Библиотека и информационное право : учебное пособие / Л. Е. Чепелева. – М. : Литера, 2014. – 176 с. – (Современная библиотека).

21. **Шеламова, Г. Н.** Библиотека выходит на улицы города : инновационные формы массовых акций / Г. Н. Шеламова, Н. Б. Ковальская. – М. : Либер-Дом, 2014. – 192 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 157).

Віцебская цэнтральная раённая бібліятэка прымала актыўны ўдзел у раённай акцыі “Поезд Перамогі”. Адбыліся сумесныя выезды бібліёбуса і аўтаклуба ў вескі Буяны, Хайсы, Лужасна. На стаянцы бібліёбуса чытачоў і жыхароў вескі віталі песнямі артысты Варонаўскага, Акцябрскага, Мазалаўскага СДК і супрацоўнікі Мазалаўскай дзіцячай школы мастацтваў.

У Сенненскім раёне для жыхароў вёсак Шынкава, Зямковічы, Алехнава было праведзена свята кнігі “Мудрости жизни учитесь у книг,” якое ўключала ўшанаванне лепшых чытачоў, віншавальны канцэрт, гульнявую праграму, а таксама сустрэчу з паэтам М. Траццяковым. Была афармлена перасоўная выстава-агляд кніг сучасных беларускіх аўтараў “Хорошим книгам – добрый путь”, з якой змаглі пазнаёміцца жыхары аддаленых вёсак.

Патрыятычнае выхаванне. Святкаванне 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне стала адным з асноўных вектараў у актывізацыі дзейнасці бібліятэк вобласці па выхаванні ў падрастаючага пакалення павагі да нацыянальнай гісторыі і культуры, фарміраванні дзяржаўнасці і патрыятызму як важнейшых маральна-духоўных і сацыяльных каштоўнасцяў.

На працягу года бібліятэчнымі ўстановамі былі арганізаваны і праведзены:

– гарадскі конкурс па стварэнні буктрэйлераў “Книга о войне: новый формат” (Віцебская абласная бібліятэка);

– акцыі “Письмо ветерану”, “Весна Победы в каждый дом” (ДУК “Лепельская цэнтралізванавая бібліятэчная сістэма”), “Стихи о войне в кармане”, “Марш Великой Победы” (ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка”), патрыятычная акцыя “Неугасимый огонь памяти”, цыкл мерапрыемстваў “Этих дней не смолкнет слава” (ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска”);

– фэст-рэквіем “Победителю-солдату посвящается…” (кніжныя і фотавыставы “Літаратурны парад Перамогі”, “Ветераны родного края”, ДУК “Лепельская цэнтралізванавая бібліятэчная сістэма”);

– культурна-адукацыйная программа “Мне выпала честь прикоснуться к Победе” (ДУК “Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”);

– выстава-інсталяцыя “Вайна ў лёсе маей сям’і” (арганізавана ў бібліёбусе і афармлена ў выглядзе міні-музея “Поезд Перамогі”, ДУК “Віцебская раённая цэнтралізваная бібліятэчная сістэма”);

– выстава-акцыя “Фронтовые страницы” (у экспазіцыі прадстаўлены лісты ўдзельнікаў вайны, а таксама ўнікальныя фотаздымкі ваеннага часу. Вынікам акцыі стала выданне зборніка “И вспомнить страшно, и забыть нельзя…”, Полацкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны);

– тыдзень памяці “И помнит мир спасённый” (ДУК “Цэнтральная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна”);

– інфармацыйная гадзіна “Никто не забыт, ничто не забыто” (ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”).

У рамках ***Года моладзі*** ў бібліятэках Віцебшчыны праведзены:

– абласны конкурс відэаролікаў “Читаем о войне” (сумесны праект БРСМ і Віцебскай абласной бібліятэкі);

– форум таленавітай моладзі Аршаншчыны “Таланты молодых” (цэнтральная бібліятэка імя А.С. Пушкіна ДУК “Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”);

– свята кнігі і чытання “BIBLIOWEEKEND” (ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка”);

– акцыя ў падтрымку чытання “Библиотека в открытом формате”, маладзёжны праект “Мы в теме”, праект па неакадэмічным вывучэнні беларускай мовы ў інтэрактыўнай форме “Мова і стыль” (Полацкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны);

– сацыяльна-культурны праект “Год 2015. Моладзь. Час. Бібліятэка” (ДУК “Лепельская цэнтралізаваня бібліятэчная сістэма”) і іншыя мерапрыемствы.

Публічныя цэнтры прававой інфармацыі. Фарміраванню адзінай інфармацыйна-прававой прасторы садзейнічала работа **96** публічных цэнтраў прававой інфармацыі, паслугамі якіх скарысталіся больш за **13** тыс. чытачоў. Колькасць зваротаў да баз дадзеных прававой тэматыкі склала больш за **15** тыс. зваротаў. На працягу года ў вобласці былі праведзены **282** юрыдычныя кансультацыі з удзелам кіраўнікоў і спецыялістаў юрыдычных служб, праваахоўных органаў, прадстаўнікоў органаў мясцовай улады.

Сёння з мэтай найбольш поўнага раскрыцця фондаў і прыцягнення новых карыстальнікаў у ПЦПІ Віцебскай вобласці афармляюцца кніжныя выставы, ладзяцца адкрытыя прагляды літаратуры, праводзяцца масавыя мерапрыемствы. У якіх прымаюць удзел прадстаўнікі праваахоўных органаў, юрысты-практыкі, медыцынскія супрацоўнікі, кіраўнікі і спецыялісты іншых ведамстваў.

У 2015 годзе ў бібліятэках ДУК “Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” праведзена каля 180 мерапрыемтваў па прававым выхаванні. Супрацоўнікі ПЦПІ цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Ф. Скарыны актыўна працавалі па мэтавых праграмах: “Основы правовых знаний”, “Правовой эрудит”, “Правовая грамотность молодежи”, “Молодежь и Закон”.

У рамках работы публічных цэнтраў ДУ “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска” для насельніцтва былі праведзены юрыдычныя кансультацыі па пытаннях сямейнага і спадчыннага права (ЦГБ імя М. Горкага), прававы дыялог “Мы и закон” з удзелам натарыуса Г. Сяргушкінай (бібліятэка імя І. Крылова), кансультацыя юрыста Віцебскага ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Г. Галай “Асновы працоўных зносін” (бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай), сустрэча юных чытачоў з інспектарам аддзела агітацыі і прапаганды ДАІ УУС В. Чэпікам, прысвечаная правілам паводзінаў на дарозе (дзіцячая бібліятэка імя А. Гайдара).

12. **Русакова, Л. Н.** Библиотека работает для Вас! День библиотек в Новополоцке / Л. Русакова // Бібліятэка ў ракурсе / складальнікі: Л. І. Макаранкава, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 15–16. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).

13. **Семенова, Ю.** Чтобы помнили потомки / Ю. Семенова // Няхай ведаюць нашчадкі / складальнікі: Л. І. Макаранкава, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 4–5. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).

14. **Труханёнок, И.** 70-летию Великой Победы – 70 фронтовых судеб / И. Труханёнок // Бібліятэчны свет. – 2015. – № 6. – С. 9–11. – (У публічных бібліятэках).

Падрыхтавала Г. Капліна

НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ ЛІТАРАТУРЫ ПА БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВЕ, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВЕ І КНІГАЗНАЎСТВЕ

Звяртаем увагу бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у вобласці інфармацыйных тэхналогій на новыя паступленні прафесійнай літаратуры, якія з’явіліся ў фондзе Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна.

1. **Алешин, Л. И.** Библиотечные сервисы : научно-практическое пособие / Л. И. Алешин, М. А. Ордынская. – М. : Литера, 2015. – 304 с. – (Современная библиотека).

2. **Алешин, Л. И.** Внестационарное библиотечное обслуживание : учебно-практическое пособие / Л. И. Алешин. – М. : Литера, 2014. – 288 с. + 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – (Современная библиотека).

3. **Алешин, Л. И.** Создание сайтов для библиотек : учебно-практическое пособие / Л. И. Алешин, М. А. Ордынская. – М. : Литера, 2013. – 272 с. – (Современная библиотека).

4. **Библиотечно-информационное** образование : новые концепции и технологии развития / [И. С. Пилко и др.]. – М. : Литера, 2014. – 304 с. – (Современная библиотека).

5. **Бородина, В. А.** Психология библиотечного обслуживания : научно-практическое пособие / В. А. Бородина. – М. : Литера, 2013. – 289 с. – (Современная библиотека).

6. **Бычкова, Е. Ф.** Экологическая информация в библиотечном мире : методическое пособие / Е. Ф. Бычкова. – М. : ГПНТБ России, 2014. – 112 с.

7. **Вертакова, Ю. В.** Связи с общественностью / Ю. В. Вертакова, О. В. Согачева. – Старый Оскол : ТНТ, 2014. – 316 с.

8. **Головко, С. И.** Культурно-просветительская деятельность библиотек : монография / С. И. Головко. – М. : Литера, 2014. – 168 с. – (Современная библиотека).

БІБЛІЯГРАФІЯ
ПУБЛІКАЦЫІ СУПРАЦОЎНІКАЎ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ПРАФЕСІЙНЫХ ВЫДАННЯХ

1. **Анегдина, М. В.** Региональный электронный проект “Афганистан. Без права на забвение”: формирование и использование / М. В. Анегдина // Медиатека и мир. – 2015. – № 1. – С. 45.
2. **Гуменник, З.** Литературный ринг : сценарий / З. Гуменник // Гэты цуд завецца – кніга / складальнікі: Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 15–17. – (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).
3. **Зуева, Т.** Духовность – категория вечная / Т. Зуева // Матулін дзень у бібліятэцы / складальнікі: Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 23–24. – (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).
4. **Калужонок, Н.** “Прававая мама” / Н. Калужонок // Матулін дзень у бібліятэцы / складальнікі: Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 26–29. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).
5. **Каралёва, А.** Мы не ў праве забыцца, мы абавязаны памятаць…” : Обальская гарпасялковая бібліятэка / А. Каралёва // Бібліятэчны свет. – 2015. – № 2. – С. 11–12.
6. **Конышева, Т. М.** С чего начинается библиотека? Размышления методиста / Т. Конышева // Бібліятэка ў ракурсе… / складальнікі: Л. І. Макаранкава, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 10 – 12. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).
7. **Кореневская, Н. С.** За правовыми знаниями в библиотеку: из опыта работы ПЦПИ г. Новополоцка / Н. С. Кореневская // Право.by. – 2015. – № 5. – С. 145 – 148.
8. **Мазго, Е.** Литературный салют любимому Лепелю / Е. Мазго // Бібліятэчны свет. – 2015. – № 5. – С. 13.
9. **Печенова, О. В.** Вырастает в поле лен: путешествие в страну белорусского шелка / О. В. Печенова // Вандроўка ў мінулае родных мясцін / складальнікі: Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 20–23. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).
10. **Печенова, О. В.** Наша пресса – на все интересы / О. В. Печенова // Гэты цуд завецца – кніга / складальнікі: Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С.36–40. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).
11. **Рогачева, Л. И.** База данных «Дарогамі вызвалення Віцебшчыны»: опыт создания и использования / Л. И. Рогачева // Территория 60: Библиотеки Псковской области : сборник / составители: О. В. Акинфиева, А. Л. Левченко ; главный редактор В. И. Павлова. – Псков : Псковская областная универсальная научная библиотека, 2015. – Вып. 17. – С. 20–22.

Праводзіцца значная інфармацыйная і кансультатыўная работа ў ПЦПІ, якія дзейнічаюць на базе ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка”. У рамках праекта “Информация о налогах для всех” спецыялістамі інспекцыі МНЗ па г. Наваполацку штомесячна праводзяцца індывідуальныя кансультацыі для фізічных і юрыдычных асоб. Арганізаваны дзяжурствы і дыстанцыйныя кансультацыі “Студэнцкай службы прававой дапамогі”. У 2015 годзе супрацоўнікі ЦБС прымалі ўдзел у Міжнародным кангрэсе “Библиотека как феномен культуры”, прадстаўляючы вопыт бібліятэчнай сістэмы ў павышэнні прававой асветы рэгіёна.

Сёння на базе бібліятэк Глыбоцкага раёна дзейнічаюць клубы прававой скіраванасці: “Сучаснік” (цэнтральная бібліятэка) і “Лінія” (Падсвільская гарпасялковая бібліятэка).

У бібліятэках вобласці выкарыстоўваюцца розныя формы папулярызацыі прававых ведаў. Адзначым шэраг мерапрыемстваў: інфармацыйная гадзіна “Сімвалы незалежнасці: гісторыя і сучаснасць” (Верхнядзвінская ЦРБ), прававы лекторый “Твое жилье – узнай о нем все” (Лёзненская ЦБС), гадзіна права “Мая краіна – мой гонар” (Полсвіжская с/б-ка Лепельскай ЦБС), інтэлект-турнір “О праве знаю всё” (Міёрская цэнтральная бібліятэка), урок самаменеджменту “Мы – будучае квітнеючай Беларусі” (Пастаўская цэнтральная бібліятэка), конкурсна-гульнявая праграма “Правовой лабиринт” (Ушацкая дзіцячая бібліятэка).

Пытанні прававой тэматыкі разглядаліся спецыялістамі бібліятэк на пасяджэннях круглых сталоў, семінарах. Так, былі праведзены круглы стол “Молодежь Беларуси: традиции и будущее” з удзелам грамадскага аб’яднання БРСМ (Наваполацк) і “Закон мне гарантирует” сумесна з ТЦСАН і таварыствам інвалідаў (Лёзна).

Ажыццяўляючы выдавецкую дзейнасць, бібліятэкі ствараюць дапаможнікі рознай тэматычнай скіраванасці: бібліяграфічныя дапаможнікі “Молодой специалист: гарантии и льготы”, “Выборы: история и современность”, “Правовое поле подростка”, “Союзное государство” (Наваполацкая ЦБС), “Пенсионная система Республики Беларусь” (Гарадоцкая ЦБС) і інш.

Аблсугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Абслугоўванне дадзенай катэгорыі насельніцтва праводзіцца ва ўсіх цэнтралізаваных бібліятэчных сістэмах Віцебскай вобласці. Актыўна працуюць у даным накірунку бібліятэкары Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Лепельскай, Аршанскай і інш. сістэм.

Так, у бібліятэках Браслаўскай ЦБС арганізавана дастаўка літаратуры і перыядычных выданняў на дом. На працягу года абслужана 254 чытачы, сярод якіх 51 з’яўляецца інвалідам.

Па папярэдніх заяўках ў бібліятэках Верхнядзвінскай ЦБС на даму абслужана 66 чытачоў.

У Віцебскім раёне для чытачоў на даму, інвалідаў, састарэлых людзей у бальніцах і аддаленых вёсках праведзены акцыі “Книгу в каждый дом”, “Мы – вместе”, “Дом з кнігай – дом без адзіноты”.

У Полацку бібліятэкі сістэмы працуюць па праграме “Чуткое сердце”, прадастаўляючы паслугі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У рамках праграмы дзейнічае хатні абанемент “Книга-103”.

У Віцебску на абслугоўванні службы “Книга на дом” знаходзіцца 38 чытачоў.

Спецыяльны фонд бібліятэк вобласці, які ўтрымлівае агучаную літаратуру, літаратуру, выдадзеную ўзбуйненым шрыфтам і шрыфтам Брайля, складае больш за 13 тыс. адзінак. На працягу года ў бібліятэкі паступіла больш за 800 экз. агучанай літаратуры на суму 57,5 млн руб.

Для абслугоўвання інвалідаў па зроку у дзвюх бібліятэках (Аршанскай цэнтральнай раённай імя А.С. Пушкіна і бібліятэцы-філіяле № 9 Полацкай раённай сеткі публічных бібліятэк) створаны спецыялізаваныя сектары. Ад сектара пазастацыянарнага абслугоўвання Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага дзейнічаюць 3 спецыялізаваныя бібліятэчныя пункты. Новыя спецыялізаваныя праграмы і тыфлаабсталяванне на працягу года не набываліся.

Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў вобласці былі праведзены шматлікія мерапрыемствы, праекты, акцыі.

У Віцебскай абласной бібліятэцы ў рамках месячніка з 15 кастрычніка па 15 лістапада дзейнічала выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Мир увидеть душой”, на якой былі прадстаўлены творчыя работы членаў Віцебскай абласной арганізацыі ГА “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку”, адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне ўдзельнікаў выставы. У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Віцебскага аддзялення ГА “БелТІЗ” К. Ламчаноўскі і старшыня абласнога аддзялення ГА “Беларускі фонд міру” Т. Туманава.

У Лепельскім раёне для інвалідаў па зроку на базе мультымедыйнага цэнтра цэнтральнай бібліятэкі былі праведзены скайп-канферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў Лепельскага раённага таварыства інвалідаў па зроку і расійскага маладзёжна-інфармацыйнага клуба з г. Балахна Ніжагародскай вобласці.

Дзейнасць бібліятэк вобласці развіваецца таксама ў рамках мэтавых праграм. Так, дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага Віцебскай ГЦБС працуе па праграме “Особые дети”. Для дзяцей-інвалідаў клуба “Востраў надзеі” супрацоўнікамі былі арганізаваны свята дабрыні “Пусть вам солнце светит ярче”, гульнявая праграма “Книжное царство, мудрое государство”, свята вясны “Вясенняя казка” і інш.

У бібліятэках прайшлі літаратурны дэбют зборніка В. Мажылоўскага “Праклён мітрапаліта Феафіла” (Браслаўская цэнтральная раённая бібліятэка), вечар-сустрэча з інвалідам па зроку А. Дубко “Талант не может быть не зрячим”, выставы творчасці інвалідаў “Ограниченные возможности и неограниченные фантазии” (ДУК “Віцебская раённая цэнтралізваная бібліятэчная сістэма) і іншыя мерапрыемствы.

Так, у Браслаўскім раёне дзейнічаў праект “*Фантазія. Творчасць. Натхненне*” (дэманстраваліся творчыя работы супрацоўнікаў бібліятэк). Упершыню да прафесійнага свята – Дня бібліятэк Беларусі – былі арганізаваны велапрабег, які прайшоў пад дэвізам “*За Чытанне!*”, нясумны вечар “*Бібліяпрыцемкі”* і бібліяфэст “*Слаўся, бібліятэка!* ”.

У Глыбоцкім раёне ўкараніліся новыя формы выставачнай работы, праводзіліся інтэрактыўныя гульні (бібліядартс).

Прыкладамі па ўкараненні ў практыку работы буйнамаштабных праектаў у г. Віцебску можна лічыць арганізацыю і правядзенне літаратурнага свята да Дня горада “*Прыцягненне Віцебскай зямлі*”, акцыю “*Бібліяноч-2015*”.

Аршанскай ЦБС да Года моладзі было распрацавана сацыякультурнае мерапрыемства – скрыжаванне пакаленняў “*Год молодежи – год Великой Победы*”, якое ўключала патрыятычны флэшмоб, акцыю “*Споём гимн вместе*”, патрыятычную культурна-адукацыйную праграму “*Мне выпала честь прикоснуться к Победе*”. Вельмі творча падышлі метадысты да распрацоўкі сцэнарнага плана па правядзенні раённага свята паэзіі “*Як жыць – дык жыць для Беларусі*”, якое адбылося ў в. Ляўкі з удзелам вядомых пісьменнікаў Віцебшчыны і Аршаншчыны: Т.І. Красновай-Гусачэнкі, Б.П. Беляжэнкі, К.Р. Нілава, С.А. Трафімава, а таксама дэлегацый з гарадоў-пабрацімаў. У 2015 годзе ў рамках святкавання рэспубліканскага Дня праваслаўнай кнігі метадыстамі быў упершыню арганізаваны і праведзены фестываль праваслаўнай кнігі “*Дорогами православия*”.

Докшыцкі раён арганізаваў рэкламны праект “*Библиотека вне стен*”. Да Дня моладзі на гарадской плошчы ладзілі тэматычную пляцоўку “*Бібліякафэ*”. У рамках рэспубліканскай акцыі *“Чытаем усёй сям’ёй*” пачаў рэалізоўвацца праект “*Сямейнае чытанне*”.

Метадысты Наваполацкай ЦБС падрыхтавалі і арганізавалі свята кнігі і чытання *“BIBLIOWEEKEND*”, у падрыхтоўцы і правядзенні якога прымалі ўдзел супрацоўнікі ўсіх бібліятэк ЦБС.

У бібліятэках Верхнядзвінска прайшлі акцыі “*З кніжкай на скамейцы*”, “*Кніжка выйшла пагуляць*”, “*Вулічная чытальная зала*”.

У Віцебскім раёне рэалізаваны праект “*Тэатр ваеннай кнігі*” і інш.

Падводзячы вынікі дзейнасці метадычных служб Віцебскай вобласці можна сцвярджаць, што яна развіваецца ў рамках традыцыйных і сучасных форм і метадаў работы. А галоўныя прыярытэты метадычных служб – аналіз і прагназаванне дзейнасці бібліятэчнай справы, вывучэнне і ўкараненне інавацыйных працэсаў у бібліятэках, развіццё навукова-метадычнай дзейнасці – скіраваны на ўдасканаленне сістэмы прафесійнай адукацыі бібліятэчных работнікаў.

дзейнасці. Супрацоўнікі аддзелаў маркетынгу выдавалі інфармацыйныя матэрыялы, сцэнарыі, электронныя прэзентацыі, друкаваліся ў прафесійным і мясцовым перыядычным друку, аказвалі дапамогу бібліятэкарам сеткі ў складанні і выданні буклетаў рознага накірунку, электронных прэзентацый, аўтарскіх мэтавых праграм, праектаў і інш.

Докшыцкай ЦБС былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі "*Прапагандуем беларускую кнігу*". Гарадоцкай ЦБС падрыхтаваны серыі буклетаў "*Выбор профессии – выбор жизненного успеха*" і *"Памяць, якой не будзе забыцця*", прысвечаныя 70-годдзю Перамогі. З лепшымі творчымі знаходкамі і дасягненнямі бібліятэк Віцебскай ГЦБС можна пазнаёміцца на старонках штоквартальнага інфармацыйнага бюлетэня "*Бібліятэчная мазаіка*", які выпускае адзел бібліятэчнай рэкламы і маркетынгу. Сенненскай ЦБС у дапамогу бібліятэкарам распрацаваны метадычны дапаможнік "*Рэклама чытання сярод моладзі*" і інш.

Бібліятэкі вобласці прымалі ўдзел у сацыялагічных даследаваннях, праводзілі анкетаванні, аналізы чытання.

У справаздачным годзе супрацоўнікі бібліятэк прынялі ўдзел у маніторынгу чытаемасці твораў членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі і рэспубліканскім даследаванні "Состояние информатизации библиотек Республики Беларусь на современном этапе".

У Шаркаўшчыне з мэтай вызначэння поглядаў моладзі на сучасную бібліятэку было праведзена сацыялагічнае даследаванне "*Библиотека. Взгляд молодёжи*", Докшыцкай сістэмай праведзена анкетаванне "*Моладзь і кніга*". Метадыстамі Наваполацка была распрацавана *анкета карыстальніка бібліятэкі ва ўзросце ад 14 гадоў да 31 года.* У Лёзна з мэтай папулярызацыі бібліятэкі, кнігі і чытання ў бібліятэках сістэмы праводзіліся бліц-апытанні і анкетаванні, аналізы чытання "*Лепшыя кнігі пра вайну*", экспрэс-апытанні для падлеткаў "*Бібліятэка для мяне – гэта…*", "*Мир чтения – молодым*" і інш.

Неад'емнай часткай бібліятэчнай практыкі з'яўляецца адлюстраванне яе дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі. Так, навіны аб галоўных падзеях бібліятэчнага жыцця горада Віцебска рэгулярна змяшчаюцца на сайтах ЦБС і Віцебскага гарвыканкама. У праграмах "Тэлерадыёкампаніі "Віцебск" "Время АРТ" і "Центр внимания" ў 2015 годзе прайшлі сюжэты з удзелам дырэктара ЦБС Г.Г. Данілавай.

Аршанскай ЦБС у мінулым годзе было прадоўжана цеснае супрацоўніцтва са СМІ. На тэлебачанні выйшла 30 сюжэтаў аб рабоце бібліятэк. Распрацаваны сумесны праект "*Библиотекарь советует прочитать*" (тэлеканал "Скіф") прадоўжыў свае існаванне. На працягу года ў выпусках праграмы "Навіны" выйшла 11 перадач. У ролі вядучых выступілі супрацоўнікі бібліятэк, якія расказвалі пра найбольш цікавыя кнігі, якія паступаюць у фонды бібліятэк.

Павышэнню прывабнасці іміджу бібліятэкі спрыяюць разнастайныя праекты, акцыі, фестывалі, мерапрыемствы, якія рэалізуюцца супрацоўнікамі аддзелаў бібліятэчных маркетынгаў.

Да Дня пажылых людзей у бібліятэках вобласці былі рэалізаваны праект "Библиотека без границ" (Браслаўская ЦРБ), праведзены акцыі "Милосердность с библиотечной пропиской" (ДУК "Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"), "Осень жизни", "Старшее поколение выбирает общение" (ДУК "Глыбоцкая цэнтралізваная бібліятэчная сістэма"), творчыя сустрэчы з паэтамі Г. Сіняковай, А. Івановым "Поэзия, гостья небесная", Б. Беляженка "Круги земные Бориса Бележенко", Н. Салаўёвай "Я напишу свою картину…" (ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска"). Для пажылых людзей дзейнічала больш за 40 клубаў, сярод якіх "Еще не вечер" пры цэнтральнай бібліятэцы імя У. Маякоўскага Наваполацкай ЦБС, "Залаты ўзрост" Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі, "Сустрэча" Друеўскай сельскай бібліятэкі Браслаўскага раёна і інш.

Сёння функцыі бібліятэчнага абслугоўвання набываюць больш шматаспектны характар, арыентуюць бібліятэкі на рашэнне цэлага комплексу задач. Першачарговымі з іх з'яўляюцца арганізацыя роўных магчымасцей доступу да інфармацыі, пашырэнне спектра інфармацыйных паслуг, стварэнне якасна новых сервісаў і служб, укараненне інавацыйных форм і метадаў работы, мадэрнізацыя тэхналагічных працэсаў абслугоўвання. З ліку задач, якія неабходна вырашаць бібліятэкам на сучасным этапе:

– актывізацыя дзейнасці, скіраванай на папулярызацыю нацыянальнай культуры, літаратуры і мастацтва ў рамках Года культуры;

– развіццё сацыяльнага партнёрства ў фарміраванні сукупнага бібліятэчнага фонду;

– карпаратыўнасць у рэалізацыі праектнай дзейнасці і стварэнні электронных рэсурсаў.

МЕТАДЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК

Балабух Т.А.,
вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства
ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

Адной з галоўных праблем, якую сёння вырашаюць метадычныя службы бібліятэк розных узроўняў, з'яўляецца праблема павышэння і абнаўлення якасці метадычных паслуг па ўсіх накірунках бібліятэчнай дзейнасці. Вырашэнне дадзенай праблемы скіравана на ўдасканаленне безперапыннай адукацыі супрацоўнікаў, развіццё новых форм сацыяльнага партнёрства, новых форм метадычнай падтрымкі праз стварэнне сумесных праектаў у адзінай віртуальнай прасторы.

Шматлікасць форм метадычнай работы стварае рэальныя ўмовы для таго, каб кожная бібліятэка – метадычны цэнтр выбрала той варыянт, які б з'яўляўся найбольш аптымальным і адпавядаў яе рэсурсным (у т.л. і кадравым) магчымасцям, мясцовым традыцыям і ўмовам. Сёння бібліятэкамі – метадычнымі цэнтрамі назапашаны багаты вопыт па самых розных накірунках метадычнай дзейнасці.

Асаблівую ролю ў метадычнай дзейнасці адыгрывае стварэнне сістэмы павышэння кваліфікацыі і дадатковай прафесійнай адукацыі бібліятэчных спецыялістаў. Самай распаўсюджанай формай павышэння кваліфікацыі застаюцца семінары, якія скіраваны не толькі на атрыманне новых ведаў і навыкаў, але і на пашырэнне кругагляду работнікаў, развіццё арганізацыйнай культуры.

Сярод семінараў, праведзеных на працягу года спецыялістамі публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, адзначым абласны семінар "*Сучасныя тэндэнцыі ў арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання: рэгіянальны вопыт*" (арганізатары – ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна" і ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна"), семінары "*Маладзёжнае скрыжаванне: прававое, маральнае, патрыятычнае выхаванне ў бібліятэках*", "*Информационно-библиографическая деятельность библиотек: состояние, проблемы, перспективы*" (Лепельская ЦБС), "*Бібліятэка для моладзі – пошук ідэальнай мадэлі*" (Чашніцкая ЦБС), "*Бібліятэка і час: пошук і выкарыстанне новых форм далучэння насельніцтва да кнігі*", "*Праектная дзейнасць бібліятэк як спосаб рэалізацыі творчых ідэй*" (Віцебская РЦБС), "*Работа з моладдзю – адзін з фактараў падтрымкі станоўчага іміджу бібліятэкі*" (Докшыцкая ЦБС). Віцебская ГЦБС правяла семінары "*Публичные библиотеки в социокультурной среде города: стратегия развития. Библиотеки Витебска: 2014 год – итоги, задачи на 2015 год*", "*Роль библиотек в выполнении государственной программы по профилактике ВИЧ-инфекции*" (сумесна з ДУ "Віцебскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі"), "*Стратегия развития современных библиотек в меняющемся мире*" (сумесна з ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева").

З нагоды 70-годдзя Вялікай Перамогі былі арганізаваны і праведзены міжнародны семінар "*70-летию Великой Победы посвящается…*" (Лёзненская ЦРБ), раённыя семінары "*Арганізацыя работы па патрыятычным выхаванні ў сістэме бібліятэк: інавацыйныя падыходы і тэхналогіі*" (Сенненская ЦБС), "*Вясна. Маладосць. Перамога*" (Шаркаўшчынская ЦБС).

Такім чынам, на працягу года бібліятэкары абмяркоўвалі важнейшыя аспекты патрыятычнага выхавання ў сучасных умовах, закраналі пытанні маральна-духоўнага выхавання моладзі, выкарыстанне сучасных тэхналогій пры папулярызацыі кнігі і чытання ў маладзёжным асяродку.

Працягвалі сваю работу Школа маладога бібліятэкара "*Библиокласс*" Браслаўскай ЦБС, бібліятэчны ліцэй "*Азбука прафесійнага майстэрства*" і прафесійны клуб *"ДИВО*" Лепельскай ЦБС, клуб бібліятэкараў "*Сустрэча*" Бешанковіцкай ЦБС. У Наваполацку прафесійная вучоба ў 2015 г. была накіравана на работу з маладымі бібліятэкарамі. Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу быў распрацаваны праект "*Год молодежи на молодежной волне*", у рамках якога прайшлі: дзень прафесійнай інфармацыі "Будущее библиотек – за молодыми!", мабільны Дзень інфармацыі «Мы "ЗА" здоровый образ жизни». Аршанскай ЦБС былі праведзены заняткі ў "*Школе маладога бібліятэкара"* для сельскіх бібліятэкараў, працягваў работу прафесійны клуб "*Сучасніца*" Міёрскай ЦБС і іншыя.

Дзейснай формай павышэння кваліфікацыі з'яўляецца правядзенне прафесійных і творчых бібліятэчных конкурсаў. Так, Полацкай ЦБС праведзены раённыя конкурсы "*О библиотеках в буклете*" (на лепшы рэкламны буклет) і "*Лепшы праект года–2015*" (на лепшы бібліятэчны праект для моладзі), Пастаўскай ЦБС – "*Береги здоровье смолоду*" (на лепшы сцэнарый па здаровым ладзе жыцця для моладзі), Сенненскай ЦБС – "*И память подвига нам книга оживляет*" (на лепшую работу па патрыятычным выхаванні да 70-годдзя Перамогі), Лёзненскай ЦБС – "Знаёмцеся, новая кніга" (на лепшую прэзентацыю новай беларускай кнігі), Чашніцкай ЦБС – краязнаўчы конкурс "*Альбом гісторыі адкрыты…*", Верхнядзвінскай ЦБС – "*Тэрыторыя ведаў і дабра*" (на лепшую публікацыю аб рабоце бібліятэк) і "*Войны священные страницы*" (на лепшы бібліяграфічны агляд літаратуры аб Вялікай Айчыннай вайне). Шумілінскай ЦБС праводзіўся раённы агляд-конкурс па актывізацыі работы бібліятэк з моладзю "*Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь*", Бешанковіцкай ЦБС – "*Бібліятэка – тэрыторыя моладзі*", Міёрскай ЦБ – конкурс па добраўпарадкаванні тэрыторый, Віцебскай ЦБС – конкурс праектаў "*От собрания книг к собранию людей*". Віцебская цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала конкурс на лепшы бібліятэчна-інавацыйны праект па рэкламе бібліятэкі "*Библиотека – как развивающая среда нового поколения*" і конкурс па стварэнні брэнда сваёй мясцовасці "*Бібліятэчнае краязнаўства – тэрыторыя вялікіх магчымасцяў*". Шаркаўшчынская ЦБС правяла конкурс прафесійнага майстэрства "*Лепшы бібліятэкар года*".

Традыцыйнымі ў бібліятэках з'яўляюцца круглыя сталы, дзе падводзяцца вынікі работы сістэмы за год і акрэсліваюцца перспектывы развіцця, адбываецца абмен вопытам, знаёмства з навінкамі літаратуры. Праводзяцца вытворчыя нарады і пасяджэнні Саветаў пры дырэктары, на якіх адбываецца знаёмства з афіцыйнай дакументацыяй, даюцца кансультацыі па асобных пытаннях дзейнасці, вырашаюцца арганізацыйныя пытанні і інш.

Немалаважнай з'яўляецца і аналітычная дзейнасць метадычных аддзелаў. Так, метадысты бібліятэчных сістэм на працягу года ажыццяўлялі маніторынг дзейнасці бібліятэк, наведвалі сельскія бібілятэкі, аказвалі метадычную і практычную дапамогу. Значная ўвага надавалася выдавецкай